# Жнівень

**1/19. Макрыны (Макрэня, Макрэні, Макрыдка)** – прысвятак, з якім асацыіруецца макрэча, дажджлівае надвор'е, аб чым сведчаць і прыказкі: «Глядзі восень па Макрыне» (Сахараў, 1927); «Як не будзе на Макрыні дажджу, то не будзе бульба гнісці ў зямлі» (Тураўскі сл., 1984); «Як на Макрэню дождж, то будзе ўсю Спасаўку дождж» (Талстая, 1986).

Гэты дзень з даждлівым надвор'ем звязаны ъ народнай метэаралогіі розных краін. Маюцца звесткі не толькі на Расіі і Украіне, але і Эстоніі, Францыі і інш.

**2/20. Ілля (Лля, Галляш)** – апякун земляробства і абаронца ад «нячыстай сілы», які увабраў у сябе рысы язычніцкага бога Перуна. Свята дажджоў і навальніц. Успрымаецца як канец лета і пачатак восені. Ілля багаты на прыказкі: «Прыйшоў Пятрок – сарваў лісток, прыйшоў Ілля – сарваў два»; «Прыйшоў Ілля – укінуў у воду кусок льда»; «Ілля нарабіў гнілля»; «На Іллю да абеда лета, а пасля абеда восень»; «Ілля ваюе з чартамі, іх б'е перунамі»; «Ілля жніво пачынае, а лета канчае»; «Калі на Іллю паспелі чарніцы, паспела і жыта»; «Ілля блізка: гніся, баба, нізка, уставай раненька, ды жні дапазненька»; «Ілля пытае, ці гатова ралля, а Успленне, ці гатова насенне»; «На святога Галляша з новых круп каша»; «Да Іллі на сене пуд мёду, а на Іллі пуд гною», «Да Іллі поп дажджу не ўмоліць, пасля Ілліна дня баба фартухом пагоніць».

Заканчвалі касавіцу, хадзілі талакою касіць удовам. У Лельчыцкім раёне гаворац: «Іванове сено – панове, а Петрове ўжэ не такове, а Іллінэ – удовінэ». Праводзілі зажынкі – свята пачатку жніва.

Святы Ілля – стара жняя.
Гаспадынька ідзець у поле,
З хлебам, соллю зажынаць
Ды з маленькім сыночкам,
Ды з сярэбраным сярпочкам...

*(Ілукстэнскі павет; Сахараў, 1940)*

Часта ўпамінаецца Ілля ў песнях, якія спяваліся на каляды:

Ілля па полю хадзіў,
Пашаньку радзіў.
Што ступлю стапою,
Як перайду гоні,
Стаяць стогі...

Па бару хадзіў
Да пчолкі радзіў.
На адной хвоі
Па пчолак двоі.

Ой, на хвоінцы
Да па троінцы...
*(Пінскі павет; Булгакоўскі, 1890)*

Ілля – адзін з папулярных вобразаў у фальклоры, нягледзячы на тое, што больш ён малюецца, як адмоўны, грозны і несправядлівы («Ілля наробіць гнілля»). Такім несправядлівым і помслівым ён паўстае з легенды «Ілля і Пятро», што была запісана А. Сержпутоўскім у Мазырскім павеце. У ёй Ілля загадвае хмарам мачыць людзям сена, а Пятро разганяе іх. «Ухваціць Пятро мятлу, -- распавядае далей народная памяць, -- і паразганяе хмары па кутках, а неба чысценька падмяце. Та ось адкуль ні вазьміся, тарахціць, едзе Ілля, крычыць, як на жывот, аж неба й зямля дрыжыць. Хмары таўкуцца, як непрытомныя, вылазяць з куткоў, і ўжо лье такі дождж, што не толькі берагі, але і груды паплывуць. Моляцца людзі Богу, што паны дзяруцца, а ў мужыкоў чубы трасуцца, моляцца й просяць, каб Бог даў пагоду. Прызаве Бог Іллю насварыцца на яго, а той і кажа, што толькі развялося нечысці-чарцей, што трэ іх громам пабіць, бо ўвесь свет запаганяць...» (1911. С. 16-17).

Жнівеньскія ліўні з бясконцымі маланкамі празвалі «рабінавымі днямі (ночамі)», якія часцей пачыналіся на Іллю. Аб даўнасці гэтага паняцця сведчыць яшчэ Цвярскі летапіс, дзе апісваецца чарнігаўская бітва 1024 г. паміж братамі Яраславам Мудрым і Мсціславам («Мстислав же слышав, изыде противу их на сечу к Листвену, и бяше осень, и ту ся сретогла... И бывше нощи рябинной, бысть тьма и гром бываше и молния и дождь. И бысть сечи зла и страшна...»).

Існуе павер'е ў народзе аб громе. Грыміць таму, што Ілля (Пярун) грукаціць на калясніцы па хмарах і кідае маланкі-стрэлы ў нячыстую сілу, якая можаператварацца ў розных звяроў каб выратавацца. У прыродзе сапраўды пасля сонцастаяння (Купалы, Пятра) назіраюцца змены надвор'я як перамога Іллі над Пятром. З гэтымі міфамі мусіць і звязана даўняя завядзёнка паляўнічых пачынаць адстрэл звяроў.

Народнае ўяўленне, што праяўляецца ў свяце Іллі, цесна звязана з біблейскай гісторыяй аб прароку Іллі, што нарадзіўся ў Фесвіі Галаадскай яшчэ да 900 год да хрысціянства. Ілля (у перакладзе з яўрэйскага «апора Божая») перад паганскімі жрацамі і ізраільскім народзе, які перастаў верыць у Адзінага і ад чаго тры гады была засуха, запаліў агнём з неба мокры ахвяравальнік, што не змаглі зрабіць жрацы са сваімі багамі. Гэтым язычнікі былі ўвераваны ў адзінага Бога, жрацы былі забіты, а народ пасля малітвы прарока атрымаў доўгачаканы і жыццядайны дождж. За

гэты і іншыя цуды Ілля па божай волі ўзляцеў у неба на вогненай калясніцы.

Адзіны старазапаведны персанаж і яго гісторыя прызнаны хрысціянскім культам побач з іншымі святымі (напрыклад, з Міколам Угоднікам). Язычніцкая традыцыя (Пярун) тут ўдала спалучылася з хрысціянскай, што трымаецца на такіх вызначальных асновах, як гром, дождж, калясніца.

У сувязі з тым, што Ілля быў узяты на неба жывым на калясніцы, то, як мяркуюць даследчыкі, гэта дапамагло вобразу атрымаць адпаведныя рысы язычніцкага грамаўніка. У Фінляндыі іжоры і водзі спраўляюць гулянні каля старых ахвярных камянёў (КЗ, 1978. С. 113). Венгры-католікі адзначаюць святога Іллеша як народы праваслаўнага веравызнання, бо хрысціянства яны прымалі некалі ў праваслаўнай форме.

Вядома больш шырокае адзначэнне свята Іллі ў Югаславіі. Там яму таксама прыдаюць уладу над громам («Грамаўнік»), часткова – над дажджом і вятрамі; вобраз падобны Перуну. Вялікім святам лічаць яго мусульмане і праваслаўныя, у меншай меры – католікі, Танцавалі, спявалі, распальвалі кастры. Іллю лічаць сваім апекуном возчыкі-славенцы, гарбары і інш – у Македоніі. Сербы ў гэты дзень звычайна збіралі мёд. Сярод рытуальных страў – мёд, кукуруза, ягня ў мусульман, стары певень – у праваслаўных.

У гарадах паўднёвай Балгарыі, дзе клімат халаднейшы, Ілля лічыцца сярэдзінай лета (средлето), а на Янаў дзень – праводзілі святы ахвяравання (Собор, Курбан). За трапезай падрыхтаванага быка ці барана ў гонар боства дажджоў і маланак язычніцкае свята злівалася з грамадскай урачыстасцю (с. 234).

З Іллёй (20 ліп.) у Румын бытуе нямала легендаў паўцаркоўнага і паўязычніцкага зместу. Міфалагічны вобраз быў звязаны яшчэ з двума: Іллёй-Пэлія, якога адзначалі 21 ліпеня, і Фокам (foc – агонь), што ганаравалі – 22.

На думку многіх даследчыкаў, Ілля захаваў рысы культа Зеўса. Асабліва гэта бачыцца на прыкладзе міфалогіі грэкаў. Магчыма, вобраз бога грома і маланкі, апекуна навальніцы і дажджу зліўся з Геліасам, богам сонца. З распаўсюджваннем хрысціянства Геліаса замяніў Ілля, дзякуючы простаму сугуччу імён: па-грэчаскі сонца – ), як лічаць тыя ж навукоўцы і прыводзяць розныя цікавыя факты (с. 274).

**4/22. Мар'я (Магдалена).** Жаночае імя хрысціянскай мiраносіцы Марыі Магдалены, якое дало назву прысвятку, асацыіруецца ў народзе з клопатамі жанчын аб ураджаі і прадказаннем надвор'я: «На Мар'ю росна – лён будзе шэры,

неўмалотны», «Цыбуля Магдалена – расці пер'е па калена» (Анічэнка, 1992). У гэтую пару ўжо дні халодныя, асабліва на поўначы. Прыкмячалі: калі туман халодны, зіма чакаецца ранняя і марозная (Ляснічы, 1990). З надвор'ем звязана і наступная прыказка: «Магдалена – вады па калена».

Цікава, што ў народаў Францыі, Бельгіі, Нідэрландаў, Германіі існуюць таксама падобныя прымаўкі, звязаныя з дажджом і св. Маргарытай (20 ліпеня), напр., «Калі ідзе дождж на св. Маргарыту, то будзе шэсць сырых тыдняў» (КЗ, 1978. С. 60-61). У некаторых народаў Еўропы перыяд з 24 ліпеня па 24 жніўня лічыцца крытычным у адносінах да надвор'я. Немцы называюць Маргарыту Пагодніцай («Margareth die Wetterfrau»), з якой прыходзіць лета, аўстрыйцы кажуць «Маргарыта і Магдаліна рэдка прыгожыя».

Фіны пачыналі касіць 13 ліпеня, таму ў старадаўніх драўляных календарах дзень пазначаны граблямі. А з'явіліся яны, згодна фінскага даследчыка К.Вілкуна, наступным чынам. Дзень Святой Маргарыты (Маркеты) пазней быў перанесены з 13 на 20 ліпеня. Як вядома, хрысціянская святая перамагла дракона сілаю сваёй веры і крыжа. Менавіта крыж напачатку быў адлюстраваны ў календарах, а затым ужо трансфармаваўся ў граблі (с. 112).

Венгерскія католікі 2 ліпеня называюць днём «святой Марыі з сярпом».

Даследчыкі ў падобных традыцыях на Магдалену ў Эстоніі і Фінляндыі аб ахвярапрынашэннях (каб мядзведзь не задраў жывёлу) бачаць праяўленне культа мядзведзя (с. 112). Немцы не пачынаюць на Марыю Магдалену (22 ліпеня) ніякай справы, бо лічыцца нешчаслівым днём і просяць у апякункі пакаяння. У скандынаўскіх народаў – спявадальны дзень хворых жанчын.

Марыя Магдалена лічыцца паплечніцай Ісуса Хрыста. Яна стаяла разам з іншымі жанчынамі ля распяцця, аплакваючы пакуты Выратавальніка, і які першым з'явіўся да яе пасля ўваскрашэння. Марыя Магдалена стала першай евангелісткай і таму яна раўнаапостальская, бо прыраўнялі яе прапаведніцкае жыццё з жыццём 12 апосталаў. Нездарма гэты вобраз займае ў іканапісі другое месца пасля Багародзіцы. Здаўна Марыя Магдалена з'яўляецца апякункаю дзяўчынак-сірот.

**6/24. Барыс (Глеб, Хлеб Барыс, Барысы, Барыс Палікоп)** – адзін з апекуноў земляробства. «Святы Барыс снапы возіць», «На Глеба і Барыса хлеба напарыся і за раллю бярыся», «Барыс і Глеб – паспеў хлеб» (Паўлюкоўскі, 1934). На Смаленшчыне прызнаваўся «грозным святам хлябоў», называўся «Хлеб Барыс». У полі не

працавалі, засцерагаліся вятроў, заканчвалі купацца (Дабравольскі, 1914). «Па Барыса за хлеб не бярыся», лічылі ў народзе. Бо Ілля пасылаў свайго суседа Барыса Палікопа забіваць перуновымі стрэламі палявых д'яблаў, які часта пападаў і спальваў копы.

У некаторых раёнах лічылі, што ад Барыса на працяу трох тыдняў павінна адбыцца «рабінавая ноч», якая нібы спрыяла пасяванню рабіны і ў якую без перапынку лье дождж і шугае навальніца.

Народ вылучыў з невялічкага шэрагу кананізаваных імён на гэты дзень князёў Барыса і Глеба, якія былі забіты іх братам Святаполкам у 1015 годзе.

**7/25. Ганны (Ганна)** – прысвятак. У каляндарных песнях паказваецца, як дбайная жняя:

Меншы святочкі носяць снапочкі,
Святы Ганны бабкі стаўляюць,
Святы Барыс бабкі злічае...
*(Лепельскі павет; Шэйн, 1887)*

Святы Барыс снапы зносіць,
Святыя Ганны дамоў возяць...
*(Барысаўскі павет; Тышкевіч, 1847)*

Прыказкі таксама малююць Ганну гаспадыняй-жняёй: «Святая Ганна снапы кладзе» (Паўлюкоўскі, 1934). Хаця лічылася, што на прысвятак можна было працаваць толькі на талацэ.

Дзень у памяць канчыны Ганны, маці Прасвятой Багародзіцы.

Італьянцы і немцы лічаць дождж ў гэты дзень з'явай дабрадзейнай. У Італіі кажуць, што дождж на святую Анну ператвараецца ў манну, або: дождж – дар святой Анны. Не толькі пачатак жніва, але арэхаў, ранняга вінаграду. Акрамя таго моладзь Польшчы ўпадабала святую, бо яшчэ кажуць: Szczesliwy, kto na Fnne upatrzy sobie panne – Шчаслівы той, хто на Анну знойдзе сабе панну (Ярмолаў, 1901. С. 391-392).

**9/27. Палікоп (Палікапа, Палікапы)** – дзень жніва, у які нібы маланка паліць копы, стагі, хаты. У некаторых раёнах Палікопам называюць дні ад Барыса да гэтага дня. Некалі стараліся ў полі не працаваць. У Столінскім раёне гавораць: «На Палікопу як робіш, выйдэ хмара і ўдарыць гром, і спаліць копу хлеба» (Талстая, 1986).

Палякі Палікопам называлі Пятра (1 жн.), грэкі «падпальшчыцай снапоў» – дзень Богамаці влахернскай (2 чэрв.).

**Панцеляймон (Панцялей).** На Магілёўшчыне лічыўся лекарам ад хвароб галавы (Раманаў, 1912). У народзе казалі: «З

Панцялея капуста пачынае ў качан завівацца. Хто на Панцялея працуе, таму надалей не пашанцуе» (Ляснічы, 1990).

Палікоп – чыста народная традыцыя, а прысвятак Панцеляймон утварыўся ад імя хрысціянскага вялікапакутніка і лекара, што знайшло адлюстраванне і ў народнай інтэрпрэтацыі гэтага вобраза.

Румыны лічаць дзень (27 ліпеня) канцом лета («лета сустракаецца з зімою»), малодшым братам Іллі і называюць святога Спадарожнікам: «Пінцiлiе Спадарожнік – уход лета» (КЗ, 1978. С. 252).

**10/28.** *Лаўрын*. Прысвятак напамінаў селяніну, што ўжо можна малоь першае жыта на муку: «На Лаўрына спяшай да млына» (БСК, 1937).

У народаў Еўропы святы даволі папулярны, з ім звязана нямала прыкмет, асабліва палякаў. Swiety Wawrzyniek wezmie lata wieniec – Святы Лаўрынец. У італьянцаў Лаўрэн у адной руцэ трымае агонь, а ў другой – дождж (Ярмолаў, 1901. С. 414-415).

Немцы гэты самы спякотны дзень звязвалі з рознымі сельскагаспадарчымі работамі. Святкаваўся у Германіі дзень Лаўрэна з другой паловы X ст. У сувязі з тым, што святы прыняў пакутніцкую смерць на пракаленай рашотцы, згодна падання, то ён і стаў абаронцам людзей, якія звязаны з агнём: пажарнікі, павары, прасавальнікі, вуглепалы (КЗ, 1978. С. 129).

У лужычан існуе прыкмета: «калі ў гэты дзень дождж, то не будзе палявых мышэй» (с. 198). Славенцы і харваты па надвор'ю варажылі, якая будзе восень. У Славеніі заканчвалі сенакос на Лаўрэнца і лічылі прысвятак завяршаючым лета (с. 215).

Народы Бельгіі і Нідэрландаў да Лаўрэна прывязвалі ўборку клубневых культураў пакуль не зачасцілі дажджы. Акрамя таго, святому прыпісваюць здольнасці аберагаць ад апёкаў і пажараў. Вячэрнія знічкі лічаць слёзамі Лаўрэна. У некаторых рэгіёнах скандынавіі Ларсок (Larsok) – пачатак восені, па ім вызначалі надвор'е.

Фіны на Лауры пачыналі сеяць ужо новым зернем, нават калі зямля была сухой і гаварылі: «Лепш на Лауры ў попел, чым на Перту (Варфаламея) у лужу» (с. 115).

**11/29.** Калі ў гэты дзень туман-- рыхтуй свіран пад авёс і ячмень (Ляснічы, 1990).

**12/30. Сіла (Іван, Іван Воін).** У праваслаўным календары гэты дзень прысвечаны апосталам ад 70-ці: Сіле, Сілуану, Крыскенту, Епенету, Андроніку, а таксама пакутніку Іаану Воіну і іншым. Народны каляндар сярод іх выдзяліў дваіх. Пра аднаго з іх у

народзе кажуць:"Хто на Сілу жыта пасее, у таго на хлеб надзея" (Паўлюкоўскі, 1934). Да гэтага часу ўжо вызвалялася нямала палёў і неабходна было распачынаць новую сяўбу. Як сведчаць Е. Раманаў, М.Косіч за Іванам Воінам у народзе замацавалася функцыя абаронцы ад злодзеяў. Прататып яго -- пакутнік Іаан (1У ст.) быў воінам у імператарскім войску Юліяна Адступніка, што накіроўваў сваіх узброеных паданых забіваць хрысціян. Але Іаан Воін вызваляў іх за што і быў пасаджаны ў цямніцу. Тут, магчыма, народны вобраз мае частковае супадзенне з хрысціянскім і пабудаваны ва ўсходніх славян на гульні слоў.

**13/31. Спасаўскія запускі** -- пярэдадзень Спасаўскага посту.

**14/1. Макавей (Макава, Макаўе, Першы Спас, Спас Мядовік**, **Медзяны Спас)** -- свята маку і мёду. Праводзілі абрады з макам , ужывалі ў ежу, рабілі варэнікі з мёдам, а таксама елі тое, у што можна было макаць. Асвячалі ваду, зёлкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам і моркваю. Ведалі: на Макавея трэба ўволю наесціся маку. На Тураўшчыне "глухі мак свецілі і осыпалі хлеў, хату от небожчыкаў. І ек на суд ішлі , то кругом себе осыпалі" (Тураўскі сл., 1984). Варажылі: "Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею,дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала" (Брагінскі раён; Талстая, 1986). Пчалаводы правяралі пчол, "макалі ў мёд нажы" Дабравольскі, 1914). Для збору мёду ўсе апраналіся па-святочнаму. Хаця і частаваліся перад асноўнай падзеяй, але без гарэлкі і закускі з рэзкім пахам. Раней запальвалі дымар "жывым агнём", выкарыстоўвалі свянцоную ваду (Сержпутоўскі, 1914).У гэты дзень надавалася вялікая роля и вадзе, праводзілі "вадзяную атправу"--крыжовае шэсце да вадаёма (Раманаў, 1912).

Існавалі прыкметы: "Як на Юр'я дождж--будзе рыбы многа, а на Макава--будзе многа грыбоў" (Талстая, 1986); "Калі на Макаўе не бывае дажджу, то будзе шмат пажараў" (Дамбавецкі, 1882).

Свята ўсебакова адлюстравана ў народнай творчасці. У валачобных песнях зазначаецца: калі Ілля "жыта зажынаіць залатым сярпом", то "Святы Макавей з поля сабіраіць", "Святы Макавей бульбы накапаў, ...рабят накарміў". Прыказкі сцвярджаюць: "Першы Спас--провады лета", "Ад Першага Спаса халодныя росы" (БСК, 1937).

**Душыкі.** У Лельчыцкім раёне у першы панядзелак Спасаўкі пяклі пячэнне ("душыкі") па колькасці душ у сям,і, макалі яго ў мёд, затым у попел. Каб пазбегнуць сустрэч са змеямі, трэба было сказаць: "Лучшэй буду душыкі ў попел мочаць, чым на сабе шохлю (змяю--А.Л.) дзержаць".

**Спасаўка (Спасаўка Ласаўка, Спажып пост)**--пятнаццаці дзённы асенні пост (да 28 жніўня). Спявалі:

Спасаўка, пералётная пташка,
Дзе лета летавала,
Дзе будзем зімаваць?
--Летавала ў пшаніцы,
У сцюдзёнай вадзіцы...
*(Бялыніцкі раён)*

**Папоў зык.** Смаленскія беларусы называлі так канец ліпеня і пачатак жніўня па аналогіі з "кароўім і конскім зыкам"(гл. 26 чэрвеня). Раней у гэты час папы хадзілі па вёсках за "ніўю"--зборам жыта для пасеву (Дабравольскі, 1914).

Цікавае асыятыўнае супадзенне адбылося ў назвах і традыцыях святкаванняў. Старадаўні звычай ушанавання маку, у якім праяўляецца язычніцкі татэмізм, і хрысціянская традыцыя памяці сямі пакутнікаў Макавеяў (166 год да Раства Хрыстова) зліліся ў народным свяце Макавей (Макава, Макаўе).

У царкоўным і народным календары Спасы (14, 19 і 29 жніўня). Першы Спас--святкаванне Усеміласцівага Спаса і Прысвятой Багародзіцы было ўведзена ў Х11 ст. пасля паходу князя Андрэя Багалюбскага на валожскіх балгар у 1164 годзе. Фалькларыст І. Крук лічыць, што тры народныя святы "запазычаны з царкоўнага календара", зусім супрацьлеглае і даволі абгрунтаванае меркаванне выказаў яго калега У. Сысоў. Ён сцвярджае, што Спас--язычніцкае бажаство, "якое ўвасобіла ў сабе Духа ўраджаю, а магчыма, што нават узначальвала цэлы пантэон Духаў поля, лесу, лугу і г.д." і пазней не асіліўшы старажытныя вераванні і погляды селяніна на Спасаўскія святкі, царква часткова асімілявала, зрабіла ідэйнае напластаванне (1997. С.197-199). Вось якім уяўляецца беларусу Спас "Святы Спас, спасі нас"(у замовах, абрадавых песнях), "Святы Іспас --стары дзядок, на восець садзіў, жыта малаціў...", "...па полі ходзіць, копы лічыць...", "...гнаі водзіць", "едзець у поле ды зямельку мяшаець, прыгатаўляець"(у валачобных песнях).

На 1 жніўня па каталіцкаму календару прыходзіцца дзень памяці святых Пятра і Макавея, аднак, як сцвярджаюць этнографы (Граздова І.), яны не аказалі ніякае ўздзеянне на кельцкае язычніцкае свята пачатку жніва ў ірландцаў (КЗ, 1978. С. 76). У скандынаўскіх народаў на свята Пятра (Peders fengsel – Пятро ў кандалах) забараняліся сельскагаспадарчыя работы. «Нарвежскі народны каляндар» ад 1898 г. вызначаў: калі на 1 жніўня дождж, то і будзе працягвацца тры тыдні (с. 102).

Румыны на Макавееў дзень (Macovei) акраплялі сады і агароды, вынішчаючы шкоднікаў, асвячалі кветкі, зёлкі, снапы і называлі яго Мядовым (Macoveiul stupilor), бо качалі першы мёд (с. 252).

У Македоніі лічаць, што з братоў Макавеяў лета пачынае паварочваць да зімы. У праваслаўных было шмат забарон: на жаночыя работы, купанне і інш.

**15/2.Базыль**.За хрысціянскім Васілём Спаса -- Кубенскім (XVст.) ці Маскоўскім Цудатворцам (1557 г.) замацавана прыказка: "Базыль авечкам воўну дае" (Паўлюкоўскі, 1934).

*Прачыстая (Першая Прачыстая, Першы святок, Зельная).*У каталіцкім календары--Унебаўзяцце Божай Маці. Існуе шмат прыказак і прыкмет на гэты дзень: "Прыйшла Прычыста -- стала поле чыста"; "Зельная Божая Маці ўсяго можа нам даці" (БСК, 1937), "Да святка араць -- лішнюю капу нажаць", "Прачыстая прынясе хлеба чыстага", "Першы Святок і першы світок" (Паўлюкоўскі, 1934). Свенцяць зёлкі, збожжа і садавіну.

У Італіі сезон летніх работ завяршаюць святам Assunta (Assunzione). У ім характэрна злілося хрысціянства з язычніцтвам. Адны бачаць паходжанне свята ў антычным святкаванні ў гонар багіні ўрадлівасці Дземетры, а італьянскія даследчыкі знаходзяць у ім рэшткі старадаўніх абрадаў Ferragosto, калі рымляне святкавалі заканчэнне жніва, ганаруючы Консуса – старажытнаітальянскага бога зямлі і пасеваў (КЗ, 1978. С.15). Некаторыя іспанскія даследчыкі лічаць, што апошняе летняе свята Успленне Багародзіцы (Asuncion de la Virgen), або па-народнаму Жнівеньская дзева(Virgen de Agosto), мае карані ў даўніх земляробчых абарадах, звязаных з уборкай ураджаю і што дзева Марыя замяніла сабою больш ранейшы вобраз багіні-маці, багіні ўрадлівасці (с. 55). У многіх краінах Еўропы на свята Успення Багародзіцы, якое было ўведзена рымска-каталіцкаю царквою ў УІІ ст., асвячаюцца зёлкі, кветкі, расліны агарода і поля, што лічылася гаючым і аберагаючым. У Скандынавіі свята Успленне ці Асенняй Богамаці (Marias himmelfart) – вялікае свята перад пачаткам апошніх асенніх работ. Германцы называюць яго Вялікім жаночым днём (grosser Frauentag), Жаночым днём у жніве, ва ўборцы (Frauentag in der Scheidung; im Schnitt; in der Ernte), Букетам жаночага дня (Buschelfrauentag). Даследчыкі (с. 129) адзначаюць, што ў гэтым вялікім царкоўным свяце дахрысціянскія і свецкія элементы пераважаюць над царкоўнымі. Выказваецца думка, што, напрыклад, літургія, якая звязана з асвячэннем зёлак павінна была замяніць язычніцкія германскія ўборачныя абрады.

Венгерскія даследчыкі лічаць, што ў каталіцкіх і пратэстанцкіх традыцыях дня Багародзіцы (nagyboldogasszony) захоўваюцца рэшткі культа нейкай старажытнай мадзьярскай багіні (с. 167).

Румынскі фальклорны матэрыял паказвае, што культ Божай маці, які вельмі папулярны ў народзе, магчыма аб'яднаў у сабе культы нейкіх язычніцкіх багінь. У некаторых раёнах, напрыклад, захаваліся сляды даўніх астральных уяўленняў аб тым, што Божая маці – зорка, размешчаная ля Месяца ці планеты Венера і інш. (с. 252).

У албанскім фальклоры тутэйшыя духі – гаспадары, якія ўяўляліся ў жаночых вобразах, зліліся з хрысціянскімі персанажамі на свята «Уваскрэшання» (Gjalliges). На ім сумесна католікі і мусульмане наведвалі «крыніцу баніні» (kronii Zojes) на самай высокай вяршыні ў гарах (с. 264).

Папулярнасць Успленя Багародзіцы ў Грэцыі даследчыкі тлумачаць тым, што з цягам распаўсюджвання хрысціянства, культ Марыі ўзнік на месце культа Афіны, які адзначаўся згодна атычнага календара ў жніўні.

(Гл. таксама: 28 жніўня).

**16/3.Антоны Віхравеі.** У народным уяўленні розныя цуды асацыіруюцца з выключнымі з'явамі прыроды. Таму і дзень Антонія Рымляніна, Наўгародскага цудатворца (1147 г.) атрымаў у людзей назву Антоны Віхравеі (БСК, 1937). Ён пазначаны маланкамі, вятрамі і дажджамі.

*Рох* --"маленькі святок", "кірмаш на паненак". Панічы і паненкі ездзілі на кірмаш, дзе з бацькамі рабілі змовіны, дамаўляліся пра пасаг. "Калі паненка гожая, та й пасагу не шмат трэе, калі ж яна няўдалая да яшчэ рабая, та пасагу трэба накінуць якую-небудзь кацярынку (царская асігнацыя) на рабацінне" (Сержпутоўскі, 1930).

Святы жыў у Францыі (пасля 1327 года і перад 1420 годам). За сваю святасць ён пасля смерці стаў апекуном ад заразы.

У палякаў прысвятак звязаны з уборкаю гароха. Na swiety Rosh – w stodole droch – На святы рох у гумне гарох. Адпаведна французы і італьянцы асацыіруюць святога з капустай і арэхамі (Ярмолаў, 1901. С. 422).

**17/4. Еўдакія.** Прысвятак, які напамінаў аб уборцы агуркоў (Анічэнка, 1992). Раней на Русі Еўдакію называлі Агурэчніцай, Малінаўкай і Сенагрэйкай (Усаў, 1997).

Хрысціянская Еўдакія ў ІУ ст. разам з дзевяцю тысячамі іншых была ўзята ў палон войскамі персідскага цара, дзе займалася прапаведніцтвам хрысціянства, за што згубіла галаву.

**19/6. Яблычны Спас (Спас, Другі Спас, Вялікі Спас, Сярэдні Спас, Іспас)**, свята садавіны. Асвячаюць садавіну, пасля чаго дазвалялася ўжо есці яблыкі, грушы, слівы. Таму і гаварылі:"Добра яблычка к Іспасу" (Сержпутоўскі, 1930). Да гэтага не дазвалялася есці яблыкі, бо яны лічыліся грэшнымі пладамі. Згодна Бібліі, змей-спакушальнік праз яблык зрабіў грэшнай Еву.Таму першыя плады неабходна было асвяціць у дзень Пераўтварэння Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста. Асвячалі таксама мёд, каласкі новага ўраджаю. Усё можна было ўжываць у ежу, аб чым і сцвярджала прыказка: "Спас -- усяму час". Пачыналі сеяць азіміну.

Да ўсходу сонца праводзілі абрад выгнання клапоў. "Прыйшоў Спас, штоб не было клапоў у вас!" (Раманаў, 1912). Паколькі на тую пару з'яўляецца шмат аваднёў, таму ў Лельчыцкім раёне кажуць: "Прыйшоў Спас, то пабярэ чорт і нас".

Надвор'е становіцца халаднейшае і наогул лічыцца, што ўжо скончылася лета. "Прыйшоў Спас -- і лета ад нас"; "Першы і Другі Спас -- бяры рукавіцы ў запас" (Паўлюкоўскі, 1934). У валачобных песнях спяваецца:

Святы Спасік, пільны часік,
Жытцо возіць, Бога просіць:
--Піранясі, Божа, маё жытцо...
праз гумянцо.

А святы Іспас, старэнькі дзядок,
На восець садзіў, жыта малаціў.

Святы Іспас
Яблыкі свенціць...
Ён гнаі возіць...
Жыта пасвяшчаіць.

Царкоўнае святкаванне звязана з біблейскімі падзеямі. Ісус Хрыстос збіраўся ў апошні раз ісці ў Іерусалім. На гары Фавор яго вучні ўбачылі нечакана пераўтворанага Ісуса (у белым адзенні, асветлены сонцам твар) і пачулі нябесны голас: "Гэта ёсць Сын Мой Любімы, у Якім Мая добрая воля, Яго слухайце". Значэнне пераўтварэнне ў тым, што Хрыстос паказаны не як адзін з роўных апосталаў, а які стаіць над імі.

У сербаў царкоўнае Пераўтварэнне аддзяляе лета ад зімы. Замест яблыкаў амаль такую ж ролю як у нас займае вінаград. Пасля асвячэння яго можна ўжо было ўжываць. Вынімалі соты з вулляў, забаранялася купацца, існавалі іншыя павер'і і прыкметы. У румын, акрамя таго, у гэты дзень стараліся не крыўдзіць дзяцей і суседзяў.

**23/10 Лаўрэн (Лаўрын).** Як вядома з папярэдняга адпаведнага прысвятка (гл. 10 жніўня), Лаўрын, ці Лаўрэн, з'яўляецца днём млынара. Паколькі работа млыноў у мінулым залежала ад ветру і вады, то таму народныя прыкметы былі скіраваны да гэтых з'яў: калі хвалявалася вада, то восень абяцала быць ціхмянай, лагоднай, а зіма —мяккай, адліжнай (Ляснічы, 1990). Захавалася і прыказка: «Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень» (БСК, 1939).

Назву прысвятку даў царкоўны каляндар, які азначае ў гэты дзень памяць шэрагу імён, у тым ліку, пакутніка Лаўрэнція Рымскага (258 г.) і блажэннага Лаўрэнція, Хрыста дзеля юродзівага, Калужскага (1515 г.). У адрозненне ад беларусаў, у рускіх Лаўрэнцій лічыцца лекарам хворых вачэй, водахістальнікам.

**24/11.** *Баўтрамей (Бартэк, Баўтрук).* Прыказкі, звязаныя з прысвяткам, добра характарызуюць надыход восені: «Святы Баўтрамей душыць аваднёў і труціць мухі»; «Святы Баўтармей высылае буслоў па дзяцей»; «Прыйшоў Баўтрамей—жыта на зіму сей» (Паўлюкоўскі, 1934); «Які Батрэк нясець дзень, такая будзець і восень»; «На святога Баўтрука бліжэй да агня рука»; «На святой Бартэк кінь жыта паўчвяртэк» (Ярмолаў, 1901. С. 427).

Асабліва ў палякаў, дзе святы найбольш папулярны, маюцца падобныя прымаўкі і прыкметы. – «Na swieyy Bartek rzuc zyta polcwiartek» -- На святы Вяртэк кінь жыта паўчвяртэк. «Na swietego Bartomieja oswieca sie, siew i knieja» – На святога Варфаламея пара сеяць і паляваць. «Swiety Bartlomej zwiastuje, jaka, jieien naste, puje» -- Святы Варфаламей звястуе, якая восень наступае.

Італьянцы лічаць, што ўжо ластаўка адлятае сабе з богам (там жа).

Англічане таксама ў сваіх прыкметах звязвалі прысвятак з надыходам новай пары: «Святы Барталамей прыносіць халодную расу» (КЗ, 1978. С. 80). У Скандынавіі на Барсок (Barsok) рэжуць дробных свойскіх жывёл і лічаць, што русалка ідзе са сваім табуном з пашы (с. 104). Фіны знаходзяць у сваіх традыцыях сляды авечага культу (с. 116). Немцы лічаць: «калі не пажата поле і палегла жыта, то Барталамей прайшоў», «Барталамей прыносіць спеласць і снег» (с. 130). Сваё свята адзначалі рыбаловы, пастухі, леснікі, праводзіліся

кірмашы. У народаў Швейцарыі ў Альпах праводзілі абрады першага падзелу сыроў паміж гаспадарамі статкаў.

(Гл. таксама: 7 верасня).

**Спасаўскія Дзяды**—пятніца-субота перад Успленнем, абрадавая памінальная вячэра.

**Чарвівая нядзеля.**У некаторых мясцінах Віцебшчыны перад Успленнем пачынаецца так званая Чарвівая нядзеля, на якую не сеялі, бо ўраджай нібы даваў затым «чарвівую муку» са шкоднікамі (Нікіфароўскі, 1897).

**27/14. Міхей.** Прысвятак, па якім прагназіравалі надвор'е на верасень: дажджлівы, калі на Міхея бура ці вецер; лічылася таксама, што ў гэты дзень выспяваюць брусніцы (Анічэнка, 1992).

**28/15. Прачыстая (Успленне, Багародзіца, Першая Прачыстая, Вялікая Прачыстая, Аспажа, Гаспажа, Спажа, Вялікая Спажа, Зялёная, Зельная)**—свята ўраджаю і падрыхтоўкі да сяўбы.

Асвячалі «бараду»—апошні снапок, зернем якога пасля Прачыстай пачыналі засеўкі, а таксама зёлкі і гародніну. Наладжвалі свята свечкі: пераносілі яе з адной хаты ў другую, гасцявалі. На Палессі ўпраўляліся з просам і у гэты дзень варылі з яго кашу. Наглядалі за буслямі, што на зжатых палетках збіраліся і вырай.

Амаль паўсюдна вядомы прыказкі: «Прыйшла Прачыстая—стала поле чыстае», «Прачыста—сяўба чыста, а касьба не чыста». Менш распаўсюджаны наступныя: «Гаспажа—хлеба дзяжа»(Брэсцкі павет; Крачкоўскі, 1874); «Прыйшла Прачыстая—перапечка чыстая»(Ігуменскі павет; Шэйн, 1883); «Прачыстая не глядзіць бяла, а глядзіць, каб паляніца была»(Клічаўскі раён), «Надышло Успленне – цягні бульбу за карэнне» (Столінскі раён).

Прачыста маці ішла зажынаці
У чыстае поле з пшонным пірагом.
З пшонным пірагом, з залатым сярпом.
У левай руцэ пшонны піражок,
У правай руцэ залаты сярпок:
Я раз разну—я сноп нажну,
Я і два разну—я капу нажну!
Сноп ад снапа—на валовішча,
Капа ад капы—паўтараста шагоў!

*(Магілёўская губ.;Раманаў, 1912)*

Прачыста жытцо сеець,
А меншая ў помач стала,
Жытцо скора запахала.

*(Міёрскі раён)*

У некаторых раёнах лічылася, што ад Прачыстай пачынаецца «маладое бабскае лета» (да Галавасека, 11 верасня) (Раманаў, 1912).

Як вынікае з фальклорных матэрыялаў , засеўкі, што праводзілі звычайна пасля Прачыстай, з'яўляліся вельмі важным этапам у земляробчым календары беларускага сялянства. Фалькларыстамі мінулага зафіксавана вялікая колькасць звычаяў, абрадаў і павер'яў, што датычаць гэтага моманту, ад якога ў многім залежаў будучы ўраджай. Тут, як і ў іншых вялікіх святах, добра перапляліся старадаўнія язычніцкія і хрысціянскія традыцыі. Першыя звязаны з такімі магічнымі атрыбутамі, як «поўня», «яйка», «сякера», «ахвяраванне зямлі», «сустрэча», «чысціня» і іншымі, што суправаджаюцца рознымі і шматлікімі павер'ямі, другія—з асвечаным зернем, малітвай. Даследчыкі выказваюць думку, што 15 жніўня (па ст. ст.) можна лічыць агульнаславянскім святам ураджаю (Уласаў, 1993. С. 131). Царква прынцыпова ў гэты дзень наладжвала асвячэнне семяннога зерня, без якога нельга было пачынаць сяўбу. Гэтая акалічнасць вельмі паўплывала на змяненне ў народных традыцыях. Такім чынам хрысціянская царква адзначала Дзень смерці—Успленне Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі, душу якой без пакутаў прыняў у царства нябеснае Госпад Ісус.

У народаў Італіі, Германіі, польшчы і іншых існуюць прыкметы звязаныя з Успеннем, аб прадказанні ўраджая. Немцы на Krautwiehe асвячаюць расліны і захоўваюць дзеля аховы дома ад маланкі.

**29/16.** *Ян.* «Ян па лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

У Скандынаўскіх народаў існуе павер'е, што на Іаана нельга рубіць кусты і лес, бо чалавек захварэе (КЗ, 1978. С. 104).

**Трэці Спас (Малы Спас, Хлебны Спас, Арэхавы Спас)**— адно са свят хлеба.

Шмат дзе спраўлялі дажынкі—свята канца жніва. Упрыгожвалі стужкамі і кветкамі «бараду». Ахвяравалі хлеб і соль духу нівы, відаць Воласу, казлападобнай істоце. «Воласаву бародку» жнеі неслі гаспадару і ставілі ў кут. Зерне і каласкі ўжывалі на працягу ўсяго года ў розных магічных абрадах. На Палессі, напрыклад, «вылівалі Волас»--пры дапамозе каласкоў вады і замовы: «Волас, Волас, выйдзі на чысты колас...» перасцерагалі ад зубнога болю.У іншых раёнах «лячылі» «валасень».

Канец жніва і змена надвор'я адлюстраваны ў прыказках: «Трэці Спас хлеба прыпас»; «Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе» і інш.

У некаторых раёнах гэты дзень яшчэ называюць Арэхавым Спасам, бо раней у царкве асвянчалі арэхі, якія нарыхтоўваліся дзецьмі.

Яшчэ К.ышынскі ў 1914 г. зафіксаваў, што на Усходнім Палессі «На дажынкі падаюць чвэрць гарэлкі і пеўня; або пеўня, яечню, рыбу і парася; певень абавязкова павінен быць» (1928. С. 223). Згадкі аб рытуальнай страве фіксуюць і сучасныя крыніцы (Тураўскі сл., 1983. С. 27; 1987. С. 412). Жніўныя рытуальныя стравы з пеўнем вядомы народам Еўропы, дзе даследчыкі лічаць іх рэшткамі ахвярапрынашэння (КЗ, 1978).

Міфалогія жніва найбольшае развіццё і захаванасць атрымала ў беларускіх абрадах і жніўнай паэзіі. У нас існуюць такія вобразы як Багач, Жыцень, Жытняя Баба, Спарыш, Рай (Раёк). Аналізуючы погляды вучоных на дажынкавыя песні, А.Ліс не без падстаў бачыць у двух апошніх, што звязаны з жытняй «барадой», «як міфапаэтычнае ўвасабленне ўрадлівасці, якое ў вачах славян-язычнікаў мела функцыі дабратворнага боства» (1993. С. 129-134; 1998. С. 130). Добрую этнамастацкую падборку фактаў наяўнасці ў ткацтве, вышыўцы, названых язычніцкіх вобразаў ураджаю зрабіў М.Кацар у кнізе «Беларускі арнамент» (1996. С. 20-35).

Царква адзначае дзень памяці перанясення з Едэсы ў Канстанцінопаль Нерукатворны Абраз (Убрус) Госпада Ісуса Хрыста (944 г.).

У рускіх «барада» больш ахрысціянілася. Аб гэтым сведчаць яе назвы ў розных рэгіёнах: борода Илья-пророку, Ильюшкина борода, Николе на бороду, борода Фролам-Лаврам, Христу на бородку (Коваль, 1995. С. 20). На Украіне перад жнівом «завівалі бараду Воласу» (Ярмолаў, 1901. С. 378).

Падобны абрад заяршэння жніва існаваў, напрыклад, у Францыі (Латарынгія, першая пал. XIX ст.). Жнец, які першы зразаў апошнія каласкі аб'яўляўся «каралём букета», атрымліваў права звязаць апошні сноп і выбраць сабе «каралеўну». Пара ўсяляк ганаравалася. Адметным было тое, што апошнія каласкі поля былі каля ўтыкнутай у зямлю галінкі («Май»), якая ўпрыгожвалася стужкамі і кветкамі, і на вяршыні знаходзіўся прывязаны жывы певень, што станавіўся пасля рытуальнай стравай. У Нармандыі апошні сноп называлі «каралевай» і вадзілі вакол яго карагод. Сербы і чарнагорцы называлі яго божай барадой (божја, богова, богу барада). Югаслаўскія даследчыкі звязваюць апошні сноп, з ахвярай язычніцкаму боству Дабогу, ці духу зерня, ці нейкаму невядомаму (КЗ, 1978. С. 204). Французкія даследчыкі таксама бачаць у жніўных абрадах адгалоскі язычніцтва, народныя ўяўленні звязваюць з

раслінным духам, які захоўваецца ў апошнім снапе (с. 28-31). Народы Бельгіі і Нідэрландаў у апошнюю нядзелю ліпеня святкуюць Нядзелю жняца (Maaierszondag ag maaier – галандск. – касец, жнец). Яшчэ ў некаторых правінцыях можна ўбачыць упрыгожаныя дамы па-даўняму звычаю снапамі жыта і аўса, дзяўчаты ў час жніва носяць шырокаполыя шляпы, а мужчыны-касары абвешаны кветкамі (с. 61).

Абрады з апошнім снапом і пеўнем вядомы многім народам і іх дахрысціянская сутнасць не выклікае сумнення. Так, яшчэ ў ХУІ ст. у ніжненямецкіх землях апошні сноп сяляне прысвячалі язычніцкаму боству Водану, апекуну ўраджая (с. 132). Шырокае развіццё атрымалі абрады і гульні з пеўнем, дух якога знаходзіцца ў апошніх каласах жыта. Іх зразаць у некаторых раёнах Германіі даручалі нявесце, ці цнатлівай дзяўчыне. Жыту апошняга снапа таксама прыдавалася магічнае значэнне. Важным атрыбутам выступаў і вянок. У Польшчы праводзілася забава «Біць пеўня» (Kokota bic). Хлопцы з закрытымі вачыма стараліся разбіць палкамі гаршок з пеўнем. Пераможца станавіўся «каралём». Даследчыкі звязваюць даўні абрад з «рэшткамі старажытнай крывавай ахвяры» (с. 179). У нашых суседзяў «дажынкі» складаліся таксама з чатырох асноўных частак: абраду з апошніх каласкоў, працэсія з імі, уручэнне снапка гаспадару і частаванне. Падобныя жніўныя абрады, звязаныя з «барадой», апошнім снапом, існавалі і ў далёкай Грэцыі.

**30/17. Міроны Ветрагоны.** Позні летні прысвятак застаецца ў памяці дзякуючы прымаўцы: «Міроны Ветрагоны пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць» (Анічэнка, 1992).

Праваслаўны каляндар пачынае спіс кананізаваных святых на гэты дзень пакутнікам Міронам правіцерам (250 г.).

**31/18. Флор і Лаўр (Храл і Ягор'е)**—«конскае свята», свята пастухоў. Даглядалі жывёлу. У некаторых раёнах пяклі аладкі , якія называлі «капытамі» (Цэбрыкаў, 1862; Раманаў, 1912). «На Храла і Ягор'я ня ткуць і ня пашуць»,--гаварылі беларусы на Смаленшчыне (Дабравольскі, 1894).

Хрысціянскі народ не толькі змяняў на свой манер імёны пакутнікаў Флора і Лаўра, якія жылі ў 2 стагоддзі ў Візантыі, затым у Ілірыі (Югаславіі), а і лічыць братоў-каменацёсаў апекунамі коней.

**Арабінавыя дзень і ноч (Варавіты дзень)**—пара, калі бывае «сухая» навальніца або буран цэлую ноч (дзень). У гэты час нічога не рабілі і чакалі з трывогай грому, маланкі і дажджу, засцерагаліся ад няшчасця (Булгакоўскі, 1890). Як ужо згадвалася, «рабінаву ноч»

яшчэ звязвалі са Спасаўкай або з нейкім днём ад Барысава да Прачыстай, ці ад Першай да Другой Прачыстай.